хоку, танка. Бясспрэчна, паэт сваёй творчасцю ў гэтых жанрах прадэманстраваў нам станоўчыя моманты «лаканічнага» пісьма. Да заслуг паэта неабходна дадаць, што ён стварае класічныя ўзоры танка і хоку, у той час, як у творчасці іншых беларускіх паэтаў можна назіраць парушэнне нарматыўнасці, якое выклікана імкненнем разняволіць гэтыя вершаваныя формы (танка Р. Барадуліна «Пад зялёную руку»).

На шляху авалодання жанрамі танка, хоку беларускае вершаскладанне дасягнула значных поспехаў. Усвядомленыя эстэтычныя пошукі сучаснага паэта Я. Збажыны ў вышэй пералічаных жанравых формах вызначаюцца ўнутранай сілай пачуцця. Мастак слова далучае чытача да вырашэння агульначалавечых праблем, напаўняе верш роздумна-медытатыўнымі інтанацыямі, арганічна паядноўвае ў творы агульначалавечыя і нацыянальныя праблемы, з максімальнай сцісласцю выяўляе значную, глыбокую думку. Праца ў жанрах танка і хоку спрыяе актыўнаму развіццю індывідуальнага пачатку, вучыць уважлівым адносінам да слова, актывізуе працэс нараджэння сімвалічных вобразаў, выпрацоўвае ўменне афарыстычна мысліць. Відавочна, працягваючы традыцыі М. Багдановіча, сучасны паэт пасяхова папаўняе скарбніцу сусветнай культуры, напаўняе цвёрдыя вершаваныя формы, якія не атрымалі паўсядзённай прапіскі на беларускай глебе, нацыянальным духам, наглядна паказвае, як беларускае слова яскрава гучыць у магутнай плыні сусветнай літаратуры.

СПІС ЦЫТАВАНЫХ КРЫНІЦ

1. Адамчык, У. Лёс хоку // Круглы год: Хоку беларускіх паэтаў. – Мінск: Літаратура, 1996. С. 5 – 6.
2. Каско, А. Самакаштоўнасць характва // Заря. – 1996. – 12 декабря. – С. 3.
3. Кудласевіч, А. Memento Mori // Анталогія беларускай эпітафіі / Уклад., аўт. прадм. і арт. А. Кудласевіч. – Мінск: Ураджай, 2000. – 222 с.
4. Гніламёдаў, У. Сучасная беларуская паэзія: Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 304 с.
5. Федарцова, Т. З гісторыі цвёрдых жанравых формаў // Роднае слова. – 2000. – № 12. – С. 37 – 38.

УДК 882.6.09
***Канцавы М.М.***
***Навуковы кіраўнік: канд. філалагічных навук Борсук Н.М.***

## УЗБАГАЧЭННЕ БАГДАНОВІЧАЎСКАЙ ТРАДЫЦЫІ

Праблема традыцый і наватарства ўваходзіць у кола актуальных пытанняў, якімі займаецца сучаснае літаратуразнаўства. Арыентацыя мастакоў слова на пераемнасць лепшых традыцый папярэднікаў – адзін з надзейных сродкаў агульнага пад'ёму культуры, літаратуры. «Як бы ні быў геніяльны пісьменнік, ён не з'яўляецца сам цераз сябе. У ім жыве ўся культура чалавецтва» [1, с. 28]. З літаратуразнаўчага боку асаблівую значнасць для нас уяўляе прыватнае пытанне літаратурнай пераемнасці – традыцыі, што ідзе ад пісьменніка да пісьменніка, ад старэйшага пакалення творцаў да наступных паэтычных пакаленняў. У такім ракурсе нас цікавіць уплыў традыцый М. Багдановіча на сучасных паэтаў (на матэрыяле творчасці паэтаў Берасцейшчыны). Гэты важны аспект акрэсленай праблемы і стане самастойным прадметам нашага даследавання.

Наследаванне мастаку слова, якога адчуваеш блізкім сабе па духу, светаадчуванні, спрыяе выяўленню творчай індывідуальнасці і вопытных, і пачынаючых творцаў, актывізацыі іх як мастацка-эстэтычных, філасофскіх, маральных пошукаў, так і знаходак у галіне паэтыкі. Такім чынам, паняцце «традыцыя» не сінанімічнае нечаму кансерватыўнаму, адмоўнаму. «Сапраўднымі наватарамі нярэдка аказваюцца не эксперымента-

тары – а «традыцыяналісты» [2, с. 61]. У. Гніламёдаў перакананы, што слова «традыцыяналісты» – зусім не ганебнае. Гэтая думка яскрава прасочваецца і ў працах даследчыкаў розных літаратур – М. Бахціна [3], А. Бушміна [4], Дз. Ліхачова [5] і інш. «Пераемнасць не з'яўляецца перашкодай для наватарства, яна толькі ахоўвае яго ад беспадстаўных блуканняў, вызначае яму накірунак паступальнага руху» [4, с. 43]. Як бачна, А. Бушмін перакананы, што спыніць дзеянне аб'ектыўнага закону гістарычнай пераемнасці немагчыма.

Асэнсаванне працэсу развіцця літаратуры з пункту погляду дыялектычнай узаемасувязі традыцыйнага і наватарскага дазваляе нам наблізіцца да вывучэння творчай індывідуальнасці паэта, мастацкай з'явы не адасоблена і застыла, а ў шырокім узаемадзеянні. «Гэтая дыялектычная сувязь па закону адмаўлення ўключае не толькі моманты адмаўлення і абвяржэння, але – і гэта ў першую чаргу – моманты сінтэзу, наследвання і пераемнасці, абумоўленай далейшым паступальным развіццём і пашырэннем рэчаіснасці – гэтай вечнай крыніцы літаратурна-мастацкага абнаўлення» [2, с. 167].

Вернасць «сапраўднай традыцыі» (М.Танк), «традыцыі са знакам плюс» (У. Гніламёдаў), творчае наследаванне «свабоднай традыцыі» (Эрн), «усвядомленае пачуццё мінулага» (Эліот) жывяць у душы нашага сучасніка патрыятычны настрой, утаймоўваюць нізкія пачуцці, выклікаюць пратэст супраць абязлічвання асобы, спрыяюць «поиску живого в старом, его продолжению, а не механическому подражанию отмершему» [5, с. 52].

Такім чынам, развіваць і ўзбагачаць літаратурныя традыцыі здольны талент, асоба творчая, працаздольная, якая тонка адчувае патрэбы і настрой сучасніка, бо традыцыя акумулюе ў сабе мудрасць, жыццёвы, творчы вопыт не аднаго пакалення мастакоў слова. Па гэтай прычыне нам непрымальна пазіцыя Ю. Тынянава, на думку якога, «говорить о преемственности приходится только при явлении школы, эпигонства, но не при явлениях литературной эволюции, принцип которой – борьба и смена» [6, с. 272].

Нямала намаганняў прыклалі даследчыкі на вывучэнне пытання творчых сувязей класіка беларускай літаратуры М. Багдановіча з яго літаратурнымі папярэднікамі і паслядоўнікамі. Цікавасць уяўляюць даследаванні А. Кабаковіч, У. Гніламёдава, В. Каваленкі, М. Грынчыка і інш.

Традыцыя М. Багдановіча і традыцыя, якая вызначана яго іменем – багдановічаўская, – гэта не адно і тое ж. Багдановічаўская традыцыя ўяўляе сабой сінтэз непасрэдна таго, што творца запачаткаваў сваёй паэтычнай дзейнасцю, плюс калектыўны вопыт, які атрымаў у яго творчасці найбольш поўнае і дасканалае выяўленне, а таксама і тое, што ў наступным вопыце народжана ўплывам мастака слова.

Прайшло амаль цэлае стагоддзе з часу, калі жыў і пісаў паэт, таму на сённяшні дзень вызначыць уплыў М. Багдановіча на сучасных паэтаў як у чыстым, «дыстыляваным» выглядзе, так і ў калектыўным літаратурным вопыце, які пастаянна абнаўляецца, даволі складана. Неабходна ўлічваць той факт, што сучасныя паэты звычайна ўбіраюць творчыя традыцыі непрыкметна для сябе, немэтанакіравана, інтуітыўна, бо паэзія М. Багдановіча жыве ў іх душы на сапраўды падсвядомым узроўні (назіраюцца прыклады і мэтанакіраванай далучанасці нашых сучаснікаў да традыцый М. Багдановіча). Па гэтай прычыне паэт проста не можа ўсвядоміць характар і ступень літаратурных уплываў, якія ён зведаў на працягу сваёй творчасці.

Вышэй выказаныя думкі яскрава ілюструюць адказы паэтаў на пытанне: «Ці адчулі Вы ўплыў М. Багдановіча на сваю творчасць?» Вось некаторыя з іх.

Алесь Каско. «Гамер і Пушкін ... / Аддаю павагу. / Купалу, Багдановіча люблю».

Мікола Пракаповіч. «Крыўдна, што мы не паспелі ні заўважыць, ні ўсвядоміць, як па нітачцы, па каліўцу распраналі нашы душы. Па-ранейшаму няўпэўнена топчамся мы ля падножжа той вяршыні, на якой засталіся М. Багдановіч, Я. Купала, У. Караткевіч, У. Калеснік... Яны пазначылі нам шлях. / Хадзема, сябры...

Ніна Мацяш, М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас ... пасылаліся нам Богам. Сейбіты былі і ёсць, іх не адна ўжо й сотня, а поле беларускага менталітэту й дагэтуль няўробленае. Перачытваю творчую спадчыну М. Багдановіча і прама ў вочы сурова глядзіць сучаснасць і патрабуе адказу ад кожнага з нас... У душы надоўга, калі не назаўсёды, застаецца тое высокае святло перамогі над адзінотай – хай сабе і часовай перамогі, – без якога ўвогуле няма «поўнай чары» жыцця».

Зінаіда Дудзюк. «Мая творчая індывідуальнасць фарміравалася пад уплывам Я. Коласа. Да мяне гэты паэт прыйшоў яшчэ ў маленстве. У падлеткавым узросце захапілася М. Лермантавым. З творчасцю М. Багдановіча бліжэй пазнаёмілася, калі было ўжо за дваццаць. Харошы паэт! Вабіць тонкім лірызмам, глыбокім псіхалагізмам, адчуваннем беларускасці (М. Багдановіч заставаўся беларусам, нягледзячы ні на якое асяроддзе), хаця непасрэднага ўплыву паэта на сваю творчасць не адчула».

Алесь Паплаўскі. «Творчасць М. Багдановіча вабіла мяне заўжды меладычнасцю радка. Як не дзіўна, але багдановічаўская «Зорка Венера» прыйшла да мяне песняй. Адзін з першых вершаў М. Багдановіча, які давялося прачытаць яшчэ ў школе і вывучыць на памяць, – «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі». Санетная форма, у якой напісаны дадзены паэтычны твор, з тых часоў не дае пакою. Часам спрабую свае сілы ў жанры санета, але пакуль што на суд чытача не выношу».

Сяргей Амяльчук. «На пачатку творчага шляху ўразілі і сёння хвалююць жанравыя пошукі М. Багдановіча. Напісаныя мною трыялет, напаўсанет, – бясспрэчна, гэта пад уплывам беларускага класіка».

Відавочна, функцыянальнае значэнне літаратурных уздзеянняў разнапланавае. Галоўнае, што сувязь паміж крыніцай уздзеяння і паэтам не ператварылася ў перайманьніцтва, у павярхоўную стылізацыю, як сведчыць праведзенае даследаванне.

Сучасныя мастакі слова шэраг вершаў прысвяцілі М. Багдановічу (Н. Мацяш «Між квецівам снегу й пяшчотнай сняжніцаю вішні», М. Пракаповіч «Як чакаў ты гэтае сустрэчы», А. Каско «Калі я перад Пушкіным, Гамерам...», З. Дудзюк «Цябе мне убачыць толькі з дальняй зоркі» і інш.). Гэта сведчанне таго, што яны імкнуцца вывяраць сваю творчасць, жыццёвую пазіцыю, мастакоўскую самасць па творчых набытках беларускага класіка. Аналіз вершаў-прысвячэнняў М. Багдановічу паказвае, што, нягледзячы на тое, што няма прамых нашчадкаў багдановічаўскага роду, ёсць на Беларусі нашчадкі яго па духу. «Палуян, Гарун, Янішчыц / Гэта ўсё Максімаў род», – піша В. Вабішчэвіч у вершы «Максіму Багдановічу». Пералік імёнаў можна доўжыць. Сярод іх значнае і прыкметнае месца займаюць сучасныя берасцейскія паэты.

Берасцейская зямля стала жыватворнаю глебаю для засваення і творчага развіцця традыцый М. Багдановіча па некалькіх прычынах.

Па-першае, творчасць беларускага класіка М. Багдановіча была папулярнай у Заходняй Беларусі яшчэ ў 20-30-ыя гады. Яна шырока даследавалася заходнебеларускай крытыкай, у той час, як у Савецкай Беларусі былі спробы аднесці яе да разраду несугучных часу, а ў 30-ыя гады творчасць М. Багдановіча была аб'яўлена дэкадэнцкай, а таму і зусім непатрэбнай (А. Кучар, Л. Бэндэ, М. Байкоў). І. Дварчанін, А. Навіна, М. Гарэцкі, С. Грынкевіч беражліва ставіліся да асобы і спадчыны М. Багдановіча, іх высновы па вывучэнні творчасці беларускага класіка сугучны ацэнкам сучаснага багдановічазнаўства.

Заходнебеларуская літаратура (К. Сваяк, Н. Арсеннева, В. Ластоўскі) развівалася ў накірунку трансфармацыі нацыянальных ідэалаў у агульначалавечыя каштоўнасці, арыентавалася на раскрыццё эстэтычнай сутнасці, на засваенне вопыту сусветных літаратур. Гэта было, бясспрэчна, каштоўным на фоне вульгарызацыі прынцыпаў сапраўднага мастацтва ў Савецкай Беларусі.

Па-другое, савецкая ўлада ўсталявалася на заходніх землях амаль на дваццаць гадоў пазней, чым на ўсходніх. Па гэтай прычыне ў заходнім рэгіёне пазней пачалася калектывізацыя, абеззямельванне селяніна, а значыць, і слабей была падкошана аснова годнасці асобы. Больш выразна выяўляецца ў характары заходнікаў адданасць працы, зямлі, сваяцтву. Заходнікі, як сцвярджаў У. Калеснік, «маюць гаспадарчую псіхалогію» [7, с. 149]. І ў гэтым мы схільны бачыць вытокі філасофска-інтэлектуальнай плыні ў сучаснай берасцейскай паэзіі.

Па-трэцяе, нельга не ўлічваць, што Берасцейшчына – гэта састаўная частка Берасцейска-Пінскага Палесся, адметнага рэгіёна ў славянскім свеце. Характар беларуса гэтага рэгіёна фарміраваўся пад уплывам прыроды Палесся, светаадчування палешукоў. З дзяцінства паэты ўбіралі ў сваю свядомасць народны погляд на свет прыроды, у якім шмат чаго было ад паганства, калі чалавек успрымаў сябе маленькай часцінкай прыроды: «Язычнік я. Другой не маю веры» (верш М. Пракаповіча "Язычнік я").

Па-чацвёртае, менталітэт заходнікаў вызначаецца сітуацыяй памежжа, пагранічча, пераходнасці, а стан яго душы можна ахарактарызаваць, як «стан чуйнай няўстойлівасці» (паводле М. Мішчанчука).

Па-пятае, зварот да паэзіі берасцейскіх творцаў выклікан і патрыятычнымі пачуццямі.

Па-шостае, пры вывучэнні самабытнасці, шматаблічнасці беларускай літаратуры важна ўлічваць рэгіянальны, мясцовы характар літаратур асобных рэгіёнаў. Ініцыятарам такога падыходу выступаў даследчык М. Грынчык [8]. Бясспрэчна, духоўная аснова беларускай паэзіі грунтуецца на трывалай знітаванасці паэтаў з бацькоўскім домам.

Літаратурная Берасцейшчына мае свае глыбокія даўнія традыцыі. Тым не менш, для паспяховага яе развіцця важнае значэнне набывае асэнсаванне і плённае засваенне традыцый значных мастакоў слова, у прыватнасці, М. Багдановіча. Адказы на пытанні анкеты, вышэйпералічаныя аб'ектыўныя прычыны звароту берасцейскіх мастакоў слова да духоўнай спадчыны класіка беларускай літаратуры сведчаць, што ўплыў традыцый М. Багдановіча адчулі на сваёй творчасці не толькі пачынаючыя творцы, але і сталыя мастакі слова. І ў той жа час кожны з іх, звярнуўшыся да творчай практыкі геніяльнага паэта, перакладчыка, публіцыста, празаіка, "незабыўнага шукальніка хараства" (паводле верша Н. Мацяш "Між квецівам снегу й пяшчотнай сняжніцаю вішні"), творча засвойвае традыцыі папярэдніка і настаўніка, ператварае іх ў навацыі, рухаецца па сваім уласным шляху.

### СПІС ЦЫТАВАНЫХ КРЫНІЦ

1. Бурсов, Б. Национальное своеобразие русской литературы. – Ленинград: Сов. писатель, 1967. – 396 с.
2. Гніламёдаў, У. Традыцыі і наватарства. – Мінск: Маст. літ., 1972. – 176 с.
3. Бахтин, М. Литературно-критические статьи. – Москва: Худож. лит., 1986. – 543 с.
4. Бушмин, А. Преемственность в развитии литературы. – Ленинград: Худож. лит., 1978. – 224 с.
5. Лихачёв, Д. Прошлое – к будущему: Статьи и очерки. – Ленинград: Наука, 1985. – 575 с.
6. Тынянов, Ю. Поэтика. История литературы. – Москва: Наука, 1977. – 574 с.
7. Калеснік, У. Усё чалавечае. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 381 с.
8. Грынчык, М. Рэгіянальныя традыцыі і творчасць пісьменніка // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства: Міжвуз. зборнік. – Вып. 2 / Рэд. калегія: М. Грынчык [і інш.]. – Мн.: Выд-ва БДУ, 1974. – С. 22 – 31.